В.М.САСНОЎСКІ, дацэнт
/Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт/

## ЦІ ПАТРЭБНА КАМЕРЦЫЙНАЯ ГЕАГРАФІЯ КАМЕРСАНТУ?

Змены ў палітычным, сацыяльна-эканамічным жыцці грамадства, безумоўна, не могуць не ўплываць на змест падрыхтоўкі спецыялістаў. Асабліва гэта тычыцца спецыялістаў эканамічнага профілю, якія ў сённяшніх умовах разглядаюцца "камандзірамі" рынычных пераўтварэнняў. У сувязі з гэтым вялікую цікавасць выклікае праблема вызначэння абавязковага мінімуму ведаў і асноўных патрабаванняў да уменняў, якія набываюць студэнты за час падрыхтоўкі ва універсітэце. На факультэце эканомікі і кіравання ў гандлі пачалі першымі шукаць новыя захады па ўдасканальванні вучэбнага працэсу. Прыкладам такіх пошукаў з'явілася ўключэнне ў вучэбныя планы 1992/93 навучальнага года камерцыйнай геаграфіі. На наш погляд, менавіта гэта дысцыпліна, якая вывучае заканамернасці размяшчэння, фарміравання і перамяшчэння таварных рэсурсаў, а таксама геаграфічныя аспекты другіх відаў камерцыйнай дзейнасці ў залежнасці ад прыродных, эканамічных і гістарычных умоў, у найбольшай ступені адпавядае спецыялізацыям факультэта. Натуральна, што выкладчыкі пачалі падрыхтоўку метадычных распрацовак, вучэбных дапаможнікаў і г.д. Але праз некаторы час вучэбныя планы зноў былі перагледжаны і ў іх ужо не знаходзіцца месца для вышэйназванай дысцыпліны. Гэты факт не можа расцэньвацца станоўча як з пункту погляду методыкі навучання, так і адказнасці перад выкладчыкамі. Аднак галоўнае ў тым, што, выводзячы за межы вучэбнага працэсу камерцыйную геаграфію, ствараюць "белую пляму" ў змесце падрыхтоўкі будучых спецыялістаў рынычнай эканомікі. Для такога сцвярджэння ёсць наступныя падставы. Хіба можна лічыць падрыхтаваным камерсанта да дзейнасці на рынку тавараў народнага спажывання /роўна як і на рынку сродкаў вытворчасці/ без ведання асноў геаграфіі вытворчасці, рэгіянальных асаблівасцяў фарміравання таварных рэсурсаў, умоў арганізацыі камерцыйнай дзейнасці і іх праяўлення ў розных рэгіёнах? А узяць такую спецыялізацыю, як камерцыйная дзейнасць на знешнім рынку. Тут увогуле нельга абысціся без вывучэння агульнаэканамічнага становішча краін і сітуацыі ў асобных галінах эканомікі, рэгіянальных таварных рынкаў. У якіх іншых курсах студэнты могуць атрымаць гэтыя веды? Адказ на пастаўленне пытанні, здаецца, відавочны. Спасылка ж на тое,

што ва універсітэт павінны прыходзіць геаграфічна падрыхтаваныя маладыя людзі таксама не вытрымлівае крытыкі. Дастаткова зазірнуць у вучэбную праграму сярэдняй школы і праграму камерцыйнай геаграфіі і параўнаць іх паміж сабой. Можна спасылацца і на маркетынг. Але там свой "вугал бачання"; геаграфію збыту, попыту маркетынг не вывучае. Між тым камерцыйная геаграфія не толькі б спрыяла лепшаму разуменню іншых эканамічных дысцыплін, але і дапамагла у вырашэнні практычных пытанняў, звязаных з камерцыйнай дзейнасцю.

Карысным з'яўляецца знаёмства са стандартамі вышэйшай адукацыі замежных краін. Паездкі выкладчыкаў і кіраўнікоў універсітэта ствараюць цудоўныя магчымасці для гэтага. Праўда, і на "месцы" можна сёе-тое ўбачыць. Так, заглянуўшы ў "Международную стандартную классификацию образования. Париж, ЮНЕСКО, 1977", знаходзім, сярод шматлікіх дысцыплін праграмы па кіраванні прадпрыемствамі гандлю і эканамічную геаграфію. А вось што паказвае "Каталог дисциплин и курсов, изучаемых в вузах зарубежных стран при подготовке специалистов экономического профиля. М.,1993". Пры падрыхтоўцы бакалаўра і магістра ў Японіі сярод шэрагу дысцыплін прысутнічае эканамічная геаграфія. У іншых краінах можна ўбачыць блізкія да эканамічнай геаграфіі курсы: рэгіянальнае развіццё /ЗША/, рэгіянальная структурная палітыка /Германія/ і г.д. Тое самае назіраем у вучэбных планах краін блізкага замежжа. У Санкт-Пецярбургскім універсітэце эканомікі і фінансаў прадстаўлены агульны курс "Сацыяльная і эканамічная геаграфія", у маскоўскіх ВНУ -- эканамічная геаграфія і рэгіянальная эканоміка.

Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што ў БДЭУ не вядзецца глыбокая прапрацоўка зместу падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Нярэдка інтарэсы тых ці іншых кафедраў ставяцца вышэй за агульнаўніверсітэцкія, а знаёмства з замежным вопытам у гэтай частцы носіць павярхоўны характар. Таму работу па распрацоўцы вучэбных планаў трэба карэнным чынам мяняць. Галоўнае патрабаванне да іх -- адпаведнасць часу, умовам Беларусі і ўлік сусветнага вопыту. Для дасягнення гэтага неабходна правядзенне сур'ёзнай экспертызы з боку як практыкаў /у розных міністэрствах і ведамствах/, так і навукоўцаў /у розных навукова-даследчых інстытутах, цэнтрах/. Толькі на такім шляху можна пазбегнуць кан'юнктуры і месніцтва і дабіцца больш якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў.